# ... І БОЛЬШ ЗА ТЫСЯЧУ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб арганізацыі высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыклу».**

Дакумент прадугледжвае рэалізацыю высокапрыярытэтнага, экспартаарыентаванага і імпартазамяшчальнага інвестыцыйнага праекта з будаўніцтвам заводаў па вытворчасці лізіну, трэаніну і трыптафану, камбікармоў, перапрацоўцы насення алейных культур у Пухавіцкім раёне, а таксама выкананне падпраекта «Земляробства» з мэтай вырошчвання сельскагаспадарчымі арганізацыямі збожжавых, зернебабовых і алейных культур.

У адпаведнасці з указам ствараецца закрытае акцыянернае таварыства «Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя», паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Яна будзе з'яўляцца заказчыкам па праектаванні, будаўніцтве і камплектацыі аб'ектаў аграпрамысловай вытворчасці.

У выніку будуць створаны новыя віды вытворчасці, імпартазамяшчальная прадукцыя (лізін, трэанін і трыптафан), а таксама больш за тысячу новых працоўных месцаў, што забяспечыць далейшае развіццё Рудзенска (горад-спадарожнік Мінска).

## ■ Выбары-2016

# Партыі заяўляюць пра сябе

**Партыйная палітычная сістэма ў нашай краіне пачала развівацца. Такое меркаванне выказала старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА ў праграме «Галоўны эфір» на тэлеканале «Беларусь 1».**

Лідзія Ярмошына прызналася: яе радуе, што ў Беларусі сапраўды пачала развівацца палітычная сістэма. «Паглядзіце, у нас усе партыі павялічылі колькасць прадстаўнікоў, вылучаных у якасці кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Гэта значыць, што партыі не памерлі, яны функцыянуюць, і нават тыя, якія мы прывыклі лічыць «канапавымі» (гэта значыць іх амаль не чуваць паміж выбарамі), яны ўсё роўна паспрабавалі і нейкую колькасць кандыдатаў вылучылі», — заўважыла яна.

Па ўсёй краіне кандыдатамі ў дэпутаты вылучаны 630 чалавек, у цяперашні час выбарчыя камісіі правяраюць іх дакументы, па выніках будзе прынята рашэнне аб рэгістрацыі ці адмове ў ёй. Колькасць зарэгістраваных кандыдатаў, якія змогуць пачаць агітацыю, стане вядома пасля 11 жніўня.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# УЖО АМАЛЬ 5 МІЛЬЁНАЎ ТОН!

**Уборка збожжавых у Беларусі выйшла на заключны этап. Аграрыі недалёка ад таго, каб пераступіць пяцімільённую мяжу. На 8 жніўня ў Беларусі паводле аператыўных звестак Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання намалочана 4,8 млн тон збожжавых і зернебабовых культур пры ўраджайнасці ў 34,7 ц/га. Ужо ўбрана 63,7% пасяўных плошчаў. Лідзіруе Мінская вобласць, дзе намалацілі больш за 1,3 млн тон збожжа. Намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН адзначыў, што збожжа павінны сабраць да 20 жніўня.**




У Гомельскай вобласці Рэчыцкі раён першым завяршыў масавую ўборку збожжавых каласавых і зернебабовых культур. Там засталося ўбраць толькі збожжавыя культуры позніх тэрмінаў сяўбы на нязначных участках, а таксама крупяныя культуры — проса і грэчку. Тым не менш ужо сёння можна сцвярджаць, што раён увойдзе ў лік прэтэндэнтаў на перамогу ў абласным спаборніцтве па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур.

Акрамя таго, рэкордная для Гомельскай вобласці ўраджайнасць збожжа каласавых культур (86 ц/га) атрымана на аграпрамысловым прадпрыемстве Жыткавіцкага раёна «Тураўшчына». Там ужо цалкам убраныя збожжавыя, а агульны намалот склаў 17 тыс. т збожжа, або 60% у маштабе раёна. Рэкордныя намалоты атрыманы ў першую чаргу за кошт выкарыстання тэхналогіі.

У Гродзенскай вобласці чатыры сельгаспрадпрыемствы дэманструюць ураджайнасць збожжавых звыш 70 ц/га. Самую высокую ўраджайнасць у 91,7 ц/га паказвае СВК імя Кремко Гродзенскага раёна, дзе ўбрана больш за 93% плошчы збожжавых. У СВК «Прагрэс-Верцялішкі» на гэты момант ураджайнасць складае 86,5 ц/га, гаспадарка абмалаціла 71% збожжавага палетка. У ліку лідараў таксама СВК «Свіслач» і «Абухава» Гродзенскага раёна, якія атрымалі ўраджай у 78,1 і 70,3 ц/га адпаведна. Абедзве гаспадаркі таксама ўбралі больш за 70% плошчаў збожжавых. Яшчэ сем гаспадарак намалочваюць ад 60 да 70 ц/га. Пры гэтым сярэдняя ўраджайнасць збожжавых па вобласці ніжэйшая за леташнюю, што звязана з умовамі надвор'я — засушлівым чэрвенем і дажджлівым ліпенем — 40,1 ц/га.

У Віцебскай вобласці Аршанскі і Верхнядзвінскі раёны займаюць лідзіруючыя пазіцыі па ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых культур і збіраюць 37 і 35,8 ц/га адпаведна. Таксама ўраджайнасць больш як 30 ц/га маюць 7 раёнаў вобласці. Па тэмпе ўборкі лідзіруе Пастаўскі раён, дзе абмалочана больш за 40% пасяўных плошчаў. Блізкія да гэтай лічбы аграрыі Докшыцкага, Чашніцкага, Аршанскага раёнаў.

### МІЛЬЁН НА БРЭСТЧЫНЕ

На момант падрыхтоўкі нумара стала вядома, што аграрыі Брэсцкай вобласці 8 жніўня пераадолелі мільённы рубеж па намалоце збожжа. Найбольш плённа спрацавалі аграрыі Баранавіцкага і Пружанскага раёнаў, якія ўжо атрымалі па 100 тыс. тон збожжа. Следам за імі ідуць хлебаробы з Пінскага (79,7 тыс. тон) і Камянецкага (77,5 тыс. тон) раёнаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

## ■ Блізкая ўлада

# На дзяржаву спадзявайся, але і сам старайся

**Падчас выязнога прыёму грамадзян у Стоўбцах старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам ШАПІРАМ спадарыня Марыя хадайнічала за блізкіх людзей:**

— У кватэры маёй дачкі падчас рамонту абрынулася столь, хутка будзе роўна год. У адным месцы залаталі, а ў вугле спальні з'явілася новая дзірка. Куды толькі не звярталася — адусюль адпіскі і абяцанні. А ў дачкі чацвёра непаўналетніх дзяцей:13, 14, 4 гады і 2 месяцы. На галаву немаўляці сыплецца тынкоўка ды смецце.

На слайдах, якія прадэманстравалі, сапраўды ў столі невялікая адтуліна памерам каля 50 сантыметраў.

— Падчас капітальнага рамонту гарышча ў шматпавярховым доме адзін з будаўнікоў правваліўся нагой, але ўсе непаладкі ліквідаваны. Мы не адмаўляемся залатаць і гэтую адтуліну. Тры разы да гаспадыні прыходзіла спецыяльная камісія, але ніхто ёй не адкрыў дзверы. На гэты конт ёсць адпаведныя акты, састаўленыя і падпісаныя членамі камісіі,— сцвярджае **намеснік старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Аляксандр ЦЫВАКА**.

— Здаецца, жанчына хоча пад агульны шумок, каб наогул зрабілі рамонт пamяшкання, цалкам замянілі столь, падлогу, — выказалі сваё меркаванне спецыялісты.

Дарэчы, дачка з унукамі могуць перасяліцца ў новую кватэру, пабудаваную з дзяржаўнай падтрымкай. «Але ж там няма ні акон, ні дзвярэй», — пераконвае маці.

— Няпраўда, ёсць там і дзверы і вокны, трэба толькі шпалеры паклеіць ды падлогу засцаць, паколькі дом здаецца без унутранай «аддзелкі», — пярэчаць ёй у адказ.

Ёсць яшчэ адзін варыянт. Чаму б маці не прытуліць часова сваіх родных у сябе — жыве побач у асобнай кватэры. Да таго ж, яна індывідуальны прадпрымальнік і магла б пасадзейнічаць не чужым для яе людзям залатаць тую злашчасную дзірку ў столі. Кватэра ж прыватызаваная, і ўсе работы тут павінны выконваца за кошт наймальніка. З фірмамі, якія б



узяліся за справу, сёння няма ніякіх праблем. Але ж хочацца бясплатна...

Валерый Вячаслававіч жыве ў доме, раздзеленым на дзве паловы. У 2012 годзе ён падаў дакументы на прыватызацыю часткі свайго жылля. Спецыялісты ацанілі яе ў 270 млн недэнамінаваных рублёў. Ды мужчына з гэтым не пагадзіўся. У выніку паўторнай экспертызы сума знізілася да 240 млн рублёў. Але гаспадар зноў заўпарціўся, маўляў, задорага. Ён напісаў заяву на прыпыненне дагавора. Аднак затым перадумаў і 30 чэрвеня 2016-га зноў прынёс у райвыканкам пакет дакументаў. Гэтым разам ацэначная экспертыза налічыла яму больш як 400 млн рублёў. Аказалася, што папярэднія ацэнкі праводзіліся па астаткавым балансавым коште, а не па рынкавым. І тады мужчына, як кажуць, даў задні ход, патрабуе, каб вярнуліся да вынікаў экспертызы 2012 года. Валерый Вячаслававіч мае права наняць незалежных экспертаў. Але ж за гэта трэба заплаціць...

Марыя Іванаўна патрабавала выдзялення ёй дадатковага зямельнага ўчастка ў садовым таварыстве для ўжо пабудаванай раней без дазволу лазні. **Старшыня райвыканкама Юрый ГОРЛАЎ** растлумачыў, што ў 1993 годзе жанчына атрымала ўчастак. Затым самавольна расшырыла яго межы. За што на яе былі састаўлены адміністрацыйны пратакол, але суд прыняў рашэнне не спаганяць з яе штраф з-за тэрміну даўнасці. Марыя Іванаўна пабудавала без дазволу адпаведных службаў лазню і гараж, якія выступаюць за межы ўчастка і прыхоплівацюць прыкладна паўтара метра зямель лясного фонду першай катэгорыі, якія не могуць быць выкарыстаны па іншым прызначэнні.

Мінскім аблвыканкамам прынята рашэнне, што ўсе ўзведзеныя без адпаведнага дазволу пабудовы павінны быць знесеныя. «Калі ўсе самавольныя аб'екты рэгістраваць, то пачнецца бескантрольны і хаатычны працэс будаўніцтва. Таму ўсё, што незаконна ўзведзена, будзе знесена, закон адзін для ўсіх», — катэгарычна выказаўся Сямён Шапіра.

Зусім іншая сітуацыя ў Алены Сяргееўны. Інтэлігентная, прыстойная жанчына прыйшла да кіраўніка цэнтральнага рэгіёна не з патрабаваннем, а з просьбай. Жанчыне 75 гадоў, але яшчэ працуе дворнікам у мясцовай школе. Яна выраšыла адрамантаваць стары бацькоўскі дом. Крэдыт ёй выдалі пад гарантыі паручыцеля. Штомесяц выплачвае банку па 500 тыс. рублёў (недэнамінаваных).

— Я ўжо стары чалавек, баюся, што не паспею разлічыцца. Хвалююся, што павісне доўг на жанчыне, якая пайшла мне насустрач, выручыла. Не па сумленні гэта. Хацела пагасіць крэдыт чэкамі «Жыллё», але іх не прымаюць. А можа, мне трэба запісацца на прыём у якое міністэрства? — з надзеяй заглядвала ў вочы жанчына.

Сямён Шапіра параіўся са спецыялістамі: якія ёсць варыянты, каб дапамагчы Алене Сяргееўне? Яны растлумачылі, што чэкі прымаюцца толькі на рэканструкцыю і куплю жылых памяшканняў. Разам з тым Сямён Барысавіч запэўніў, што пагутарыць з наймальнікам, магчыма, ёй дадуць нейкую прэмію, каб хутчэй разлічыцца па даўгах. Яшчэ адно выйсце з цяжкага жыццёвага становішча — завяшчаць свой дом пасля смерці дзяржаве. У гэтым выпадку пенсіянерку возьмуць на бясплатнае сацыяльнае абслугоўванне. Але ні адзін з варыянтаў заяўніцу не задаволіў. Аднак яна падзякавала за шчырасць, за тое, што яе выслухалі. А кіраўнік цэнтральнага рэгіёна пажадаў жанчыне моцнага здароўя.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## ■ Перспектывы

# У прыярытэце чыгункі — інфраструктура

**Новы пяцігадовы план развіцця Беларускай чыгункі прадугледжвае электрыфікацыю новых участкаў і аўтаматызацыю кіравання.**

Як расказаў **начальнік службы тэхнічнай палітыкі і інвестыцый Беларускай чыгункі Андрэй АЛЕЙНІК**, калі ў 2011—2015 гадах айчынны перавозчык аддаваў прыярытэт абнаўленню рухомага саставу, то цяпер прадпрыемства зробіць стаўку на развіццё інфраструктуры. У прыватнасці, з'явяцца новыя электрыфікаваныя ўчасткі Маладзечна — Гудагай і Жлобін — Калінкавічы. Участак чыгункі да Гудагая будзе электрыфікаваны і літоўскімі калегамі са свайго боку мяжы.

Акрамя таго, працягнецца стварэнне цэнтра кіравання перавозкамі, які дазволіць значна скараціць штат і павысіць бяспеку транспарціроўкі. Не спыніцца і рэалізацыя новага фармату пасажырскіх перавозак, у прыватнасці, электрапаяздыя «Гарадскіх ліній» звяжуць Мінск з яшчэ адным горадам-спадарожнікам — Фаніпалем.

Зрэшты, развіццё інфраструктуры не выключае магчымасці абнаўлення рухомага саставу. Плануецца працягваць практыку закупкі беларуска-кітайскіх электравозаў новага тыпу БКГ2, электрацягнікоў кампаніі Stadler Rail AG, дызель-цягнікоў. Агулам на развіццё Беларускай чыгункі ў 2016—2020 гадах запланавана зрасходаваць каля 14 трыльёнаў недэнамінаваных рублёў.

«Галоўныя тэндэнцыі развіцця чыгункі цяпер — гэта павелічэнне хуткасцяў і замена саставаў, — расказаў **першы намеснік начальніка пасажырскай службы ўпраўлення Беларускай чыгункі Андрэй КАШКО**. — Наша мэта — наладзіць хуткасныя перавозкі ад сталіцы да абласных гарадоў. Прыклад — запушчаны днямі сямівагонны цягнік кампаніі Stadler, які дастаўляе пасажыраў з Гомеля ў Мінск за 2 гадзіны 59 хвілін. Праз два тыдні адбудзецца замена другога цягніка па гэтым маршруце».

Што датычыцца пытання цэнаўтварэння на пасажырскія перавозкі, то фарміраваннем коштуквіткоў займаецца Міністэрства фінансаў. Аднак, як адзначаюць у Беларускай чыгунцы, усе тарыфы застаюцца стратнымі, вядзецца работа па аптымізацыі расходаў.

Датычна грузавых перавозак найбольш перспектыўным напрамкам для Беларусі **першы намеснік начальніка службы грузавой работы і знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай чыгункі Аляксандр ЯЎСЮК** назваў кітайскі. За першае паўгоддзе аб'ём кантэйнерных перавозак у гэтым напрамку павялічыўся ў два з паловай разы. Такі рост мае вялікае значэнне на фоне падзення тавараабароту паміж Расіяй і Еўропай (РФ забяспечвае больш за 90 працэнтаў транзіту айчыннай чыгункі).

«Мы ўдзельнічаем у будаўніцтве эканамічнага пояса новага Шаўковага шляху, — зазначыў Аляксандр Яўсюк. — Частка кітайскіх экспарцёраў, якія вырабляюць тавары з высокай прыбавачнай вартасцю, што маюць невялікі жыццёвы цыкл, хоча скарачаць час дастаўкі сваёй прадукцыі ў Еўропу. Калі па моры час транспарціроўкі складае 40—60 сутак, то па чыгунцы — ад 15 да 20. Асабліва гэта актуальна для ўнутрыкантынентальных гарадоў Кітая».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*